# Сучасная беларуская драматургія

Сучасная беларуская драматургія тэматычна разнапланавая. Тэма вёскі, тэма вайны складаюць асноўны змест творчасці многіх аўтараў. У сучаснай драматургіі можна вылучыць тры асноўныя тэмы: чалавек, жыццё, гісторыя. Тэмы гэтыя — вечныя, заўсёды актуальныя, на лініі перасячэння з імі ўзнікаюць іншыя тэмы, матывы, праблемы.

# Адзін з самых вядомых сучасных драматургаў — Аляксей Дудараў.

- Аляксей Дудараў нарадзіўся 6 чэрвеня 1950 года ў сялянскай сям'і. У 1968 годзе скончыў Наваполацкую прафесійна-тэхнічнае вучылішча нафтавікоў. Служыў у СА (1968-1970), працаваў монтёром сувязі (1968), слесарам (1970-1972). У 1976 годзе скончыў тэатральны факультэт Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута. Быў акцёрам, памочнікам галоўнага рэжысёра па літаратурнай частцы Беларускага рэспубліканскага тэатра юнага гледача (1976-1979). У 1979-1983 гг. быў членам сцэнарна-рэдакцыйнай калегіі Беларускага тэлебачання. Сакратар Саюза тэатральных дзеячаў БССР з 1987 года. Галоўны рэдактар часопіса «Мастацтва» з 1991 года. З 1992 года стаў старшынёй Беларускага саюза тэатральных дзеячаў.



# Дэбютаваў у друку ў 1973. Пісаў апавяданні, казкі для дзяцей. Вядомы як драматург і кінадраматург.

- Пераклаў на беларускую мову хроніку У.Шэкспіра «Рычард ІІІ». Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны» і інш. узнагародамі. Лаўрэат прэмій Ленінскага камсамола Беларусі (1982) за зборнік апавяданняў «Святая птушка» і п'есу «Выбар», Ленінскага камсамола (1984) за творы апошніх гадоў, Дзяржаўнай прэміі СССР (1985) за спектакль «Радавыя», прэміі Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва (2002). Адзначаны спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2000).



- У Беларусі і за яе межамі ў шэрагу тэатраў пачалі ставіцца п'есы "Парог"У Беларусі і за яе межамі ў шэрагу тэатраў пачалі ставіцца п'есы "Парог", "Вечар"У Беларусі і за яе межамі ў шэрагу тэатраў пачалі ставіцца п'есы "Парог", "Вечар", "Радавыя", збіраючы вялікую аўдыторыю, выклікаючы пільную ўвагу крытыкі, спрэчкі ў друку. Бясспрэчна адно: кароткая акцёрская кар'ера назаўсёды прывіла будучаму драматургу дасканалае








- "Парог" (1983) — першы шырокавядомы твор Аляксея Дударава, які выклікаў ажыўленую палеміку ў прэсе. У полі зроку драматурга — чалавечая асоба, якая не прымае нормаў, паводле якіх жыве людская маса. Алкаголік, дэмаралізаваная і цынічная асоба Андрэй Буслай пратэстуе супраць "сытасці" і "цвярозасці", што апанавалі грамадства. Аднак ні гарэлка, ні ўнутраны стыхійны пратэст не робяць Буслая лепшым, чуйным. Ён — прычына няшчасцяў ва ўласнай сям'і, пакут жонкі і бацькоў. Ён — "жывы труп".

- У п'есе «Вечар» адчуваецца боль і трывога за лёс неперспектыўных вёсак. Героі яе пражылі аднолькавыя па працягласці, але розныя па сэнсе жыцці. Для герояў п'есы «Вечар» надышоў вечар жыцця, калі можна раздумваць аб пражытым, аб сэнсе чалавечага жыцця ўвогуле. У гэтых роздумах і боль за скалечаны лёс, за стан сучаснай вёскі, і пакаянне. Пытанне ж пакарання за канкрэтную віну Мікіты здымаецца ў сувязі са смерцю персанажа.






- П'еса А. Дударава «Радавыя» прысвечана паказу Вялікай Айчыннай вайны як сусветнаЙ, агульналюдской бяды. Аўтар паказвае не толькі гераізм людзей, нязломнасць іх волі, але і тое, якой цаной была заваёвана перамога. Героямі яе з'яўляюцца пяць радавых салдат якія на сваіх плячах вынеслі ўвесь цяжар вайны. У кожнага з іх свой лёс, свая трагедыя. П'еса «Радавыя» гучыць як рэквіем па ўсіх, хто загінуў у гады ваеннага ліхалецця.

Чалавек для А. Дударава — увасабленне не толькі пэўнай часавай рэальнасці, але і вечнасці.

- Па сцэнарыях Аляксея Дударава пастаўлены кароткаметражныя ("Кола", "Дэбют", "Буслянё") і мастацкія ("Суседзі", "Белыя росы") фільмы. Таксама Дудараў інсцэніраваў раман М. Астроўскага "Як гартавалася сталь і М. Булгакава «Майстар і Маргарыта».

# П'есы і кнігі

1. Вечар
2. Кім
3. Князь Вітаўт
4. Крыж
5. Палачанка
6. Парог
7. Радавыя
8. Чорная панна
9. Нясьвіжа

1. Дыялог
2. Святая птушка
3. Апошні ўзлёт.
4. Сінявочка

# Сучасная беларуская драматургія

- вызначаецца багаццем і разнастайнасцю тэматыкі, актуальнасцю праблем. Час патрабуе ад драматургаў адлюстравання суровай праўды жыцця, стварэння праўдзівых характараў нашых сучаснікаў. Таму лейтматывам многіх п'ес з'яўляецца думка аб складанасці сучаснага жыцця, месцы і ролі ў ім чалавека. Разам з традыцыйнымі тэмамі (подзвіг у Вялікай Айчыннай вайне, мірная стваральная праца, жыццё калгаснай вёскі, маральна-этычныя праблемы) у беларускай драматургіі ўзнікаюць новыя. І адна з іх — белыя плямы ў гісторыі беларускага народа і час змрочных рэпрэсій.

# Дзякуй за ўвагу!